# Навучальныя заданні па фарміраванні метапрадметных і асобасных кампетэнцый

## Беларуская мова, III клас

**Навучанне беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі скіравана на дасягненне вучнямі не толькі прадметных, але і метапрадметных, асобасных вынікаў навучання. Важна, каб авалоданне мовай адбывалася ў комплексе з засваеннем спосабаў дзеянняў, якія спатрэбяцца вучню для рашэння разнастайных задач у рэальных жыццёвых сітуацыях. У прадстаўленым артыкуле прапануем навучальныя заданні, накіраваныя на фарміраванне асобасных кампетэнцый, пазнавальных вучэбных дзеянняў, навыкаў работы з тэкстам і інфармацыяй, некаторых камунікатыўных і рэгулятыўных дзеянняў, а таксама спецыфікацыі да заданняў. Пры распрацоўцы заданняў улічваліся падыходы міжнародных параўнальных даследаванняў PIRLS, PISA.**

Мова з'яўляецца не толькі сродкам назапашвання ведаў, фарміравання ўменняў і навыкаў, але і сродкам станаўлення асобы вучня. Авалоданне асобаснымі кампетэнцыямі адбываецца ў працэсе засваення сістэмы каштоўнасцей, правіл паводзін у грамадстве. У адпаведнасці з вучэбнай праграмай да асобасных вынікаў адносяцца: «усведамленне навучэнцамі прыналежнасці да беларускага народа, цікавасць да вывучэння беларускай мовы, сфарміраванасць асобаснага сэнсу яе вывучэння і каштоўнасных адносін да яе; імкненне авалодаць беларускай мовай як сродкам зносін, які дазваляе выражаць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме» [1].

Навучанне беларускай мове павінна быць скіравана на авалоданне наступнымі метапрадметнымі ўменнямі:

- успрымаць і асэнсоўваць вучэбны матэрыял, які прад'яўляецца ў вербальнай форме, вылучаць галоўнае ў ім, рацыянальна запамінаць, выконваць разумовыя аперацыі;
- выкарыстоўваць маўленчыя сродкі і сродкі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для рашэння камунікатыўных і пазнавальных задач;
- працаваць з вучэбнай кнігай, іншымі друкаванымі і аўдыёвізуальнымі крыніцамі інфармацыі;
- працаваць з інфармацыяй (пошук, прымяненне, захаванне), рыхтаваць сваё выступленне і выступаць з аўдыя-, відэа- і графічным суправаджэннем;
- слухаць суразмоўцу і весці дыялог, прызнаваць наяўнасць розных пунктаў гледжання, выказваць сваё меркаванне і аргументаваць яго [1].

Фарміраванне метапрадметных і асобасных кампетэнцый павінна быць «уплецена» ў засваенне прадметных ведаў. Неабходна прадугледзець паступовае авалоданне вучнямі гэтымі кампетэнцыямі на спецыяльна падабраным матэрыяле.

Чытацкая граматнасць выступае базавым (метапрадметным) уменнем. Уменне чытаць і разумець тэксты, працаваць з інфармацыяй розных тыпаў, жанраў з'яўляецца ўніверсальным сродкам навучання і саманавучання [2; 3]. Для таго каб малодшы школьнік стаў граматным чытачом, яму неабходна авалодаць наступнымі групамі чытацкіх уменняў, якія з'яўляюцца асновай разумення мастацкіх і інфармацыйных тэкстаў: 1) знаходзіць і вычляняць з тэксту інфармацыю, на яе аснове рабіць простыя вывады; 2) інтэграваць і інтэрпрэтаваць ідэі і інфармацыю з тэксту; 3) асэнсоўваць і ацэньваць змест і форму тэксту.

Усе групы адзначаных чытацкіх уменняў узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Яны дзейнічаюць як адзінае цэлае [2; 3]. На І ступені агульнай сярэдняй адукацыі адбываецца станаўленне чытацкай граматнасці. Гэта дастаткова складаны і працяглы працэс. Фарміраванне чытацкай граматнасці на аснове беларускіх тэкстаў ва ўмовах руска-беларускага білінгвізму патрабуе асаблівай увагі з боку настаўніка.

Прадстаўленыя матэрыялы ўключаюць тэксты і заданні (пытанні). Падабраныя тэксты звязаны з тэмамі, якія вывучаюцца на ўроках беларускай мовы ў III класе і дазволяць пашырыць веды вучняў у пэўнай галіне, будуць садзейнічаць комплекснаму фарміраванню прадметных, асобасных і метапрадметных кампетэнцый.

З мэтай фарміравання чытацкіх уменняў першай групы да тэкстаў прапануюцца заданні, якія матывуюць вучняў засяроджваць увагу на дэталях, арыентавацца ў змесце тэксту, знаходзіць інфармацыю, прадстаўленую ў відавочным выглядзе, канкрэтызаваць інфармацыю прыкладамі з тэксту і інш.

Для паспяховага выканання заданняў другой групы неабходна інтэграцыя трывала сфарміраваных прадметных і метапрадметных (пазнавальных, рэгулятыўных, камунікатыўных) уменняў. Заданні арыентуюць вучняў на ўстанаўленне прычынна-выніковых сувязей, знаходжанне доказаў да сцвярджэнняў, рашэнне вучэбна-практычных задач (з апорай на прадметныя веды, інфармацыю з тэксту), фармулёўку вывадаў на падставе інфармацыі, прадстаўленай у тэксце, і інш.

Трэцяя група чытацкіх уменняў патрабуе крытычнага погляду на прачытанае, выхаду за межы тэксту. Вучням прапануецца выказаць сваё меркаванне на пэўную тэму, сфармуляваць абгрунтаванне ўласнага сцвярджэння, вырашыць вучэбна-практычныя задачы з апорай на ўласны вопыт і інш.

Неабходна адзначыць, што перавага аддаецца заданням, накіраваным на фарміраванне ўменняў: рабіць вывады на аснове аналізу і параўнання з'яў, фактаў; размяркоўваць словы на групы; адрозніваць вядомае і невядомае; устанаўліваць сэнсавыя сувязі; рашаць вучэбныя і вучэбна-практычныя задачы з апорай на тэкст і ўласны вопыт; прыводзіць доказы да сцвярджэнняў. Такім чынам, выкананне распрацаваных заданняў базіруецца на прыёмах лагічнага мыслення, паміж якімі існуе строга вызначаная паслядоўнасць. Так, уменне правільна рабіць вывады ажыццяўляецца на падставе параўнання пэўных фактаў, з'яў. Такія заданні могуць выклікаць у вучняў цяжкасці. Гэта звязана з тым, што параўнанне мае на мэце выкананне пэўнай паслядоўнасці дзеянняў: вылучэнне ў аб'ектах прымет — устанаўленне агульных прымет — вылучэнне падставы для параўнання — супастаўленне аб'ектаў па вызначанай падставе [4, с. 35]. Пры неабходнасці настаўніку неабходна скарэкціраваць дзейнасць вучняў з улікам адзначанага, разабраць пакрокава этапы выканання дзеянняў.

У распрацаваных навучальных заданнях прадугледжана работа з невербальнай інфармацыяй (малюнкамі, табліцамі), што з'яўляецца асновай для авалодання ўменнямі і прыёмамі пазнавальнай дзейнасці (кадзіраванне, перакадзіраванне). Работа з рознымі крыніцамі інфармацыі будзе садзейнічаць фарміраванню ўмення рабіць абагульненне.

Вучні авалодваюць метапрадметнымі і асобаснымі вынікамі ў працэсе выканання заданняў, накіраваных на фарміраванне базавай культуры, сацыяльнай пазіцыі асобы, здольнай да адказнасці, самастойнасці, самаразвіцця, самаўдасканалення.

Навучальныя заданні прадугледжваюць выбар правільнага адказу з пераліку прапанаваных, кароткі або разгорнуты адказ, устанаўленне адпаведнасці. Для арганізацыі працы настаўнік рыхтуе раздатачны матэрыял — бланкі для выканання заданняў.

Для настаўнікаў прапануем спецыфікацыі навучальных заданняў, якія ўяўляюць сабой вызначэнне ўменняў, фарміруемых на падставе адзначаных заданняў, а таксама прыкладныя апісанні варыянтаў адказу.

Прадстаўленыя навучальныя заданні настаўнік можа скарыстаць на ўроках беларускай мовы ў III класе, факультатыўных, стымулюючых і падтрымліваючых занятках па беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання, у пазакласнай дзейнасці. Час на работу з заданнямі настаўнік вызначае самастойна з улікам падрыхтаванасці вучняў класа.

*Гатовыя карткі з навучальнымі заданнямі для вучняў размешчаны ў мультымедыйным дадатку.*

**Спецыфікацыя навучальных заданняў (работа 1)**

<table>
<tr><th>Пытанні і заданні</th><th>Уменні, якія фарміруюцца</th><th>Варыянты адказаў і/або іх апісанне</th></tr>
<tr><td>1. З якой мэтай напісаны тэкст № 1? Запішыце адказ.</td><td>Вызначаць намер аўтара тэксту.</td><td>Магчымыя розныя фармулёўкі адказу, напрыклад: Расказаць, што ў беларускай мове ёсць словы, якія маюць некалькі значэнняў; расказаць пра мнагазначныя словы.</td></tr>
<tr><td>2. Знайдзіце ў тэксце спалучэнні слоў са словам «здача». Размясціце іх у патрэбных радках табліцы.</td><td>Знаходзіць патрэбную інфармацыю ў тэксце, аналізаваць яе і размяшчаць у табліцы.</td><td><table>
<tr><th>Значэнне слова «здача»</th><th>Спалучэнне слова</th></tr>
<tr><td>праходжанне праверкі ведаў, уменняў</td><td>здача экзаменаў</td></tr>
<tr><td>перадача прадуктаў працы для далейшага выкарыстання</td><td>здача збожжа</td></tr>
<tr><td>лішак грошай, які вяртаецца пры разліку</td><td>атрымаць здачу</td></tr>
<tr><td>перадача чаго-небудзь у часовае карыстанне</td><td>здача кватэры</td></tr>
</table></td></tr>
</table>

| Пытанні і заданні | Уменні, якія фарміруюцца | Варыянты адказаў і/або іх апісанне |
|---|---|---|
| 3. У тэксце № 2 знайдзіце і падкрэсліце сінонім да слова «здача». | Знаходзіць у тэксце сінонім да прапанаванага слова. | Рэшту. |
| 4. Арцём атрымаў заданне падкрэсліць малюнкі, назвы прадметаў якіх з'яўляюцца мнагазначнымі словамі. Дапамажыце хлопчыку выканаць заданне. Выкарыстоўвайце алоўкі розных колераў, каб выдзеліць групы малюнкаў. Прыдумайце і запішыце чатыры сказы з мнагазначнымі словамі.  | Рашаць вучэбна-практычную задачу з апорай на інфармацыю з тэксту і раней набытыя веды; размяркоўваюць словы на групы. | Конь, коцік.  Вучні складаюць сказы са словамі «конь», «коцік» у розных значэннях. |
| 5. Прывядзіце два сваіх прыклады мнагазначных слоў. Якім слоўнікам вы будзеце карыстацца, каб даведацца, ці з'яўляецца слова мнагазначным? Адзначце «✔» адказ.<br>☐ Слоўнікам сінонімаў;<br>☐ арфаграфічным слоўнікам;<br>☐ беларуска-рускім слоўнікам;<br>☐ руска-беларускім слоўнікам;<br>☐ тлумачальным слоўнікам. | Рашаць вучэбна-практычную задачу і вызначаць неабходную крыніцу інфармацыі з апорай на набытыя раней веды. | Магчымыя розныя прыклады мнагазначных слоў.<br>Тлумачальным слоўнікам. |

**Спецыфікацыя навучальных заданняў (работа 2)**

| Пытанні і заданні | Уменні, якія фарміруюцца | Варыянты адказаў і/або іх апісанне |
|---|---|---|
| 1. Вучні прачыталі тэкст і зрабілі вывады. З кім вы згодныя? Адзначце «✔» адказ.<br>☐ **Дзіма**: Імёны-мянушкі давалі, каб пажартаваць з чалавека.<br>☐ **Міша**: Імёны-мянушкі неслі інфармацыю пра чалавека.<br>☐ **Аліна**: Імёны-мянушкі прыдумвалі толькі для людзей, якія чым-небудзь вылучаліся. | Вызначаць правільнасць сцвярджэнняў на аснове аналізу інфармацыі з тэксту. | **Міша**: Імёны-мянушкі неслі інфармацыю пра чалавека. |
| 2. Як вы думаеце, ці можна абысціся без імёнаў сёння? Адзначце «✔» свой варыянт адказу і абгрунтуйце яго.<br>☐ Можна, паколькі ______________.<br>☐ Нельга, паколькі ______________. | Рабіць вывады на аснове інфармацыі з тэксту і ўласнага вопыту, прагназаваць сітуацыю. | Магчымыя розныя фармулёўкі адказу, напрыклад:<br>Нельга, паколькі ў людзей ёсць неабходнасць звяртацца адзін да аднаго; людзі не будуць ведаць, як звяртацца адзін да аднаго. |
| 3. Падчас работы над якім праектам можна выкарыстаць інфармацыю з прапанаванага тэксту? Адзначце «✔» правільны варыянт адказу.<br>☐ На якой мове размаўлялі нашы продкі?<br>☐ Таямніцы імені.<br>☐ Як узніклі словы?<br>☐ Паходжанне назваў месяцаў.<br>Як вы думаеце, для каго будзе карысным і цікавым гэты праект? Запішыце адказ. | Вызначаць магчымую тэму праекта на аснове інфармацыі з тэксту; выказваць пункт гледжання з апорай на ўласны вопыт, прагназаваць магчымасць выкарыстання вынікаў даследавання. | Таямніцы імені.<br>Магчымыя розныя варыянты адказу, напрыклад:<br>Для бацькоў, якія выбіраюць імя для дзіцяці; для людзей, якія хочуць ведаць пра гісторыю паходжання свайго імені, і інш. |
| 4. Уявіце, што вам трапіла ў рукі кніга з інфармацыяй пра гісторыю ўзнікнення імёнаў. У якім раздзеле кнігі вы будзеце яе шукаць? Абвядзіце патрэбны нумар.<br>1. Адкуль ты, слова? ........ 3<br>2. Як вас завуць? ........ 40<br>3. Ад мянушкі да прозвішча ........ 61<br>4. Мова планеты Зямля ........ 82 | Самастойна арыентавацца ў змесце кнігі для пошуку неабходнай інфармацыі. | Як вас завуць? ........ 40 |
| 5. Запішыце два пытанні, на якія вы хацелі б атрымаць адказы па тэме прапанаванага тэксту. | Фармуляваць праблемныя пытанні на аснове інфармацыі з тэксту і ўласнага вопыту. | Магчымыя розныя фармулёўкі пытанняў, напрыклад:<br>Якое значэнне мае маё імя? З якой мовы прыйшло маё імя? і інш. |

**Спецыфікацыя навучальных заданняў (работа 3)**

| Пытанні і заданні | Уменні, якія фарміруюцца | Варыянты адказаў і/або іх апісанне |
|---|---|---|
| 1. З якой мовы прыйшло да нас слова «этыкет»? Адзначце «✔» правільны адказ:<br>☐ з японскай; ☐ з французскай;<br>☐ з рускай; ☐ з італьянскай. | Аналізаваць інфармацыю, рабіць вывад. | З французскай. |
| 2. У табліцы прыведзены сцвярджэнні. Насупраць кожнага сцвярджэння адзначце «✔» «так» ці «не». | Вызначаць правільнасць сцвярджэнняў на аснове абагульнення інфармацыі з тэксту і раней набытых ведаў. | (Так / Не)<br>1. Словы «этыкет» і «этыкетка» маюць адно і тое ж значэнне. — Не ✔<br>2. Маўленчы этыкет — гэта правілы паводзін людзей. — Не ✔<br>3. Усе правілы маўленчага этыкету ў розных краінах аднолькавыя. — Не ✔<br>4. Нормы этыкету трэба ведаць. — Так ✔<br>5. Пры развітанні сябру можна сказаць «Да сустрэчы!». — Так ✔ |
| 3. Знайдзіце і выпішыце з тэксту слова, блізкае па значэнні да слова «кароль». | Знаходзіць у тэксце сінонім да прапанаванага слова. | Манарх. |
| 4. Якія ветлівыя словы неабходна выкарыстаць у сітуацыях, адлюстраваных на малюнках? Злучыце ветлівыя словы і выразы з адпаведнымі малюнкамі. Якія іншыя ветлівыя словы і выразы вы выкарыстаеце ў сітуацыі, адлюстраванай на малюнку 4? Запішыце адказ.<br><br> | Рашаць вучэбна-практычную задачу з апорай на ўласны вопыт; усталёўваць адпаведнасць паміж сітуацыяй, адлюстраванай на малюнку, і формуламі маўленчага этыкету; прыводзіць прыклады раней засвоеных формул маўленчага этыкету з улікам сітуацыі. | 1 малюнак: Прабач, калі ласка!<br>2 малюнак: Дзякую за смачную вячэру!<br>3 малюнак: Да пабачэння! Бывайце здаровы!<br>4 малюнак: Добры дзень! Як справы?<br><br>Прывітанне, добрай раніцы, добры вечар. |
| 5. Чаму, на вашу думку, трэба ведаць і выконваць правілы маўленчага этыкету? Запішыце адказ. | Разважаць з апорай на інфармацыю з тэксту і ўласны вопыт; будаваць звязнае выказванне. | Магчымыя розныя фармулёўкі адказу, напрыклад:<br>Каб раптам не трапіць у няёмкае становішча, не стварыць пра сябе ўражанне як пра нявыхаванага і неадукаванага чалавека. |


**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для III класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-i-iv-klassy/iii-klass.html. — Дата доступу: 24.09.2023.
2. Цукерман, Г. А. Читательские умения российских четвероклассников: уроки PIRLS-2016 / Г. А. Цукерман, Г. С. Ковалева, В. Ю. Баранова // Вопросы образования. Educational Studies Moscow. — 2018. — № 1. — С. 58–78.
3. Гулецкая, Е. А. Формирование метапредметных компетенций в учебной и внеучебной деятельности по русскому языку в IV классе / Е. А. Гулецкая // Пачатковая школа. — 2019. — № 10. — С. 6–19.
4. Талызина, Н. Ф. Педагогическая психология : учеб. пособие / Н. Ф. Талызина. — М. : Издательский центр «Академия», 1998. — 288 с.



**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
загадчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт




*У мультымедыйным дадатку — карткі з навучальнымі заданнямі для вучняў.*